**ГУ́МАР** (ад англ. humour нораў, настрой, схільнасць), галоўная побач з сатырай праява камічнага ў маст. творы. Смешнае ў жыцці Г. выяўляе не ў здзеклівым, а ў жартоўным, добразычлівым тоне. За блюзнерствам звычайна хавае сур'ёзнае, за камічным — сумнае, за дураслівым — мудрае. Можа быць дабрадушны і жорсткі (чорны), тонкі і грубы, забаўны, чуллівы, зларадны і інш. Творы маст. л-ры гумарыст. характару выкарыстоўваюць выяўл. магчымасці *іроніі*, *гратэску*, досціпу. Для іх характэрны ўсмешка, добразычлівы жарт, мяккая смяшынка, жартаўлівы намёк, сатыр. шпілька. Генетычна бел. гумарыстыка звязана з фальклорам — узыходзіць да прыпевак, анекдотаў, жартаў, казак з камічным сюжэтам і інш. Гумар заўважаецца ў многіх творах страраж. бел. л-ры, асабліва ў творах 18—19 ст. (К.Жэра, Ф.Багамолец, В.Равінскі, І.Легатовіч, І.Ходзька, К.Вераніцын і інш.). У бел. л-ры гумарыст. творы стваралі В.Дунін-Марцінкевіч, Я.Купала, Я.Колас, А.Мрый, К.Крапіва, А.Макаёнак і інш. Сярод найб. пашыраных жанраў бел. гумарыстыкі — гумарыст. аповесць («Цыганскі кароль» У.Караткевіча), апавяданне («Дзядзіна» Ф.Багушэвіча), памфлет («Кат у белай манішцы» К.Чорнага), байка («Дыпламаваны баран» К.Крапівы); сустракаюцца *фельетон*, *гумарэска*. Бел. аўтары звяртаюцца да жартоўных паэм, вершаў і песень, ствараюцца *эпіграмы*, досціпы, літ. пародыі (М.Хведаровіч, Н.Гілевіч, Р.Барадулін і інш.). Для л-ры мяжы 20—21 ст. характэрны ананімныя гумарыст. творы («Сказ пра Лысую гару» і інш.). *В.І.Еўмянькоў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова